# ПРАЯВЫ НОНКАНФАРМІЗМУ СЯРОД ВУЧНЁЎСКАЙ МОЛАДЗІ Ў БССР У 1944–1954 гг.

**А. У. Кімбар**

*Мінскі гарадскі педагагічны каледж,*
*вул. Макаёнка, 29, 220114, г. Мінск, Беларусь, andrejkimbar@gmail.com*

У артыкуле на аснове архіўных крыніц разглядаецца дзейнасць нонканфамісцкіх арганізацый, якія ўзнікалі ў тэхнікумах і вучылішчах БССР з моманту вызвалення тэрыторыі краіны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў да сярэдзіны 1950-х гг. Вызначаюцца прычыны ўзнікнення такіх аб'яднанняў, механізмы выкрыцця і напрамкі дзейнасці камсамольскіх арганізацый па пераадоленні іх уплыву на моладзь.

***Ключавыя словы:*** ЛКСМБ; камсамол; заходнія вобласці БССР; нонканфармізм; тэхнікум; вучылішча.

# ПРОЯВЛЕНИЯ НОНКОНФОРМИЗМА СРЕДИ СТУДЕНЧЕСКОЙ МОЛОДЕЖИ В БССР В 1944–1954 гг.

**А. В. Кимбор**

*Минский городской педагогический колледж,*
*ул. Макаёнка, 29, 220114, г. Минск, Беларусь, andrejkimbar@gmail.com*

В статье на основе архивных источников рассматривается деятельность нонконформистских организаций, возникших в техникумах и училищах БССР с момента освобождения страны от немецко-фашистских захватчиков до середины 1950-х гг. Определяются причины возникновения подобных объединений, механизмы их разоблачения, направления деятельности комсомольских организаций по преодолению их влияния на молодёжь.

***Ключевые слова:*** ЛКСМБ; комсомол; западные области БССР; нонконформизм; техникум; училище.

# MANIFESTATIONS OF NONCONFORMISM AMONG STUDENTS IN THE BSSR IN 1944–1954

**A. Kimbar**

*Minsk City Pedagogical College,*
*Makayonka St., 29, 220114, Minsk, Belarus, andrejkimbar@gmail.com*

Based on archival sources, the article examines the activities of nonconformist organizations that emerged in technical schools and vocational schools of the BSSR from the moment of the liberation of the country's territory from the German-fascist invaders until the mid-1950s. The reasons for the emergence of such associations, the mechanisms of their exposure, and the directions of Komsomol organizations' activities aimed at overcoming their influence on youth are identified.

***Keywords:*** LKSMB; Komsomol; western regions of the BSSR; nonconformism; technical school; vocational school.

Пасля таго, як тэрыторыя Беларусі была вызваленая ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, у краіне ўзнік шэраг нонканфармісцкіх арганізацый з рознымі мэтамі і задачамі. Партыйныя і савецкія органы, а таксама члены грамадскіх аб'яднанняў выкрывалі дзейнасць такіх суполак. Члены Ленінскага камуністычнага саюза моладзі Беларусі (ЛКСМБ) прымалі актыўны ўдзел у выкрыцці такіх груп, але, у той жа час, некаторыя з іх прымалі ўдзел у фарміраванні і дзейнасці нонканфармісцкіх аб'яднанняў. Тэхнікумы і вучылішчы былі адным з асяродкаў утварэння такіх арганізацый.

Дадзеная праблематыка знайшла адлюстраванне ў даследаваннях айчынных гісторыкаў. Так, І. А. Валахановіч прааналізаваў дзейнасць падпольных груп і арганізацый, якія ўзнікалі ў беларускіх навучальных установах, у тым ліку на аснове матэрыялаў Цэнтральнага архіва КДБ Рэспублікі Беларусь. Сярод беларускіх аб'яднанняў такога тыпу ён разглядае дзейнасць суполак, якія ўзніклі ў Пастаўскім і Глыбоцкім педагагічных вучылішчах (педвучылішчах), і арганізацыі «Чайка» [1, с. 49–53].

Дакументы справаводства ЦК ЛКСМБ, размешчаныя ў фондзе 63п Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, дазваляюць выявіць яшчэ некалькі нонканфармісцкіх аб'яднанняў, якія дзейнічалі ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе ў тэхнікумах і вучылішчах, а таксама прасачыць рэакцыю камсамольскіх работнікаў на выкрыццё такіх груп.

Мэта дадзенай работы — аналіз дзейнасці нонканфармісцкіх суполак, якія ўзнікалі ў сярэдніх прафесіянальных і прафесіянальна-тэхнічных вучэбных установах БССР у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе.

Разгледзім дзейнасць некалькіх нонканфармісцкіх аб'яднанняў на аснове архіўных матэрыялаў ЦК ЛКСМБ.

Суполкі, якія ўзніклі ў 1946 г. Пастаўскім і Глыбоцкім педвучылішчах, паводле пастановы бюро ЦК ЛКСМБ ад 17 чэрвеня 1947 г. прызнаваліся антысавецкімі нацыяналістычнымі групамі, якія скарысталіся стратай пільнасці камітэтаў камсамола і разгарнулі антысавецкую прапаганду сярод студэнтаў, што запаволіла рост камсамольскіх арганізацый і паменшыла іх уплыў на моладзь [2, арк. 12].

У дакладзе пра стан палітычнай работы сярод моладзі ў Пастаўскім раёне і ў Пастаўскім педвучылішчы, падрыхтаваным інструктарам аддзела прапаганды і агітацыі ЦК ЛКСМБ Мазайскім, адзначалася, што большасць моладзі адгукалася на размовы пра камсамол, многія думалі ўступаць у арганізацыю, але яны не ведалі гісторыі камсамола, а таксама сярод іх моцныя рэлігійныя перакананні. Частка моладзі знаходзілася пад уплывам бацькоў, якія забаранялі ўступаць у камсамол. Раённы камітэт ЛКСМБ абвінавачваўся ў тым, што такія настроі не былі ўлічаныя пры рабоце, а таксама ў

кепскай арганізацыі палітычнай асветы і прапаганды [2, арк. 5–6]. Асабліва крытыкавалася кіраўніцтва дзейнасці пярвічнай арганізацыяй ЛКСМБ у педвучылішчы. Дадзеная арганізацыя на працягу 1947 г. да сакавіка прыняла ў камсамол толькі трох навучэнцаў з 70 некамсамольцаў. Пры гэтым адзначаецца, што пасля выкрыцця антысавецкай групоўкі за тры з паловай месяцы ў камсамол уступілі 31 чалавек. Таксама ў педвучылішчы была кепска арганізавана лекцыйная работа. Навучэнцы знаходзіліся ў кепскіх побытавых умовах [2, арк. 8].

Глыбоцкі і Пастаўскі райкамы ЛКСМБ і іх сакратары былі абвінавачаныя ў тым, што перасталі прымаць удзел у кіраўніцтве камсамольскіх арганізацый педвучылішч, не аказвалі ім практычнай дапамогі. Бюро райкамаў не абмяркоўвала работу дадзеных арганізацый [2, арк. 11–12].

І. А. Валахановіч адзначае, што своеасаблівасць дадзеных арганізацый заключалася ў тым, што вучнёўская моладзь, у тым ліку і камсамольцы, востра адрэагавала на перагібы ў правядзенні ўнутрыпалітычных мерапрыемстваў савецкай улады пасля вайны. А фармальнае ўступленне ў гады Вялікай Айчыннай вайны некаторых з удзельнікаў дадзеных суполак у Саюз беларускай моладзі не сведчыць пра выпрацоўку ў іх на гэтай аснове сталых антысавецкіх прынцыпаў [1, с. 50].

У другой палове лістапада 1951 г. у Беларускім электратэхнікуме сувязі (г. Пінск) у другой групе ІІ курса радыёаддзялення ўзнікла суполка пад назвай «Анархісты». У яе ўваходзілі навучэнцы Бедынерман, Ляшко, Барадаўка і Белы. На адным з урокаў імі былі зробленыя чатыры членскія білеты. Ляшко намаляваў на кожным білеце эмблему: чэрап і скрыжаваныя косткі. Таксама на білетах было напісана: «Анархия — мать порядка», «Анархисты, объединяйтесь!», «За измену — смерть!». Дадзеныя білеты атрымалі навучэнцы Нікалаёнак, Чашко, Козел, Брухан, але адразу пасля ўручэння «дакументы» былі знішчаныя. Усе названыя навучэнцы, акрамя Барадаўкі, былі членамі камсамола. Суполка праіснавала некалькі дзён і была выкрытая камсамольскім групаргам Мялешка і класным кіраўніком Мойжас. З навучэнцамі была праведзеная размова, падчас якой стала зразумела, што яны не разумеюць сутнасці анархізму.

Як адзначаецца ў спецыяльным паведамленні Пінскага абласнога камітэта ЛКСМБ, узнікненне дадзенай суполкі стала вынікам нізкага ідэйнага ўзроўню палітычнай і культурна-масавай работы. 26 снежня 1951 г. на Пленуме гарадскога камітэта КП(б)Б абмяркоўвалася пытанне «Аб стане вучэбна-выхаваўчай работы ў школах і вучэбных установах горада Пінска». 29 снежня 1951 г. на пасяджэнні бюро абкама ЛКСМБ праведзеныя мерапрыемствы, накіраваныя на ўзмацненне ідэалагічнай работы сярод студэнтаў тэхнікума сувязі, настаўніцкага інстытута і іншых сярэдніх вучэбных устаноў Пінскай вобласці [3, арк. 126–127].

У кастрычніку 1954 г. у навучэнцаў Жыровіцкага тэхнікума механізацыі сельскай гаспадаркі адбыўся канфлікт з адміністрацыяй навучальнай установы, вынікам чаго стала адмова выходзіць на заняткі. 20 кастрычніка навучэнец чацвёртай групы IV курса Шавярэнка на занятках па сельскагаспадарчых машынах выйшаў сцерці надпісы на дошцы і намаляваў сілуэт чалавека. Выкладчык Бельскі палічыў гэта за абразу і выдаліў навучэнца з заняткаў. Праз дзве гадзіны пад уплывам Бельскага і іншых выкладчыкаў дырэктар тэхнікума Анісаў выдаў загад аб адлічэнні Шавярэнкі з навучальнай установы. Гэтым жа загадам быў адлічаны з тэхнікума навучэнец Шэры (за п'янку), а яшчэ пяць навучэнцаў патрапілі пад адміністрацыйныя спагнанні за здзейсненыя імі раней праступкі. Пасля апублікавання загада навучэнцы групы, у якой вучыўся Шавярэнка, напісалі на імя дырэктара калектыўную заяву, дзе прасілі пакінуць яго ў тэхнікуме. Дадзеная заява была адхіленая дырэктарам.

Ноччу з 20 на 21 кастрычніка ў будынку тэхнікума былі вывешаныя тры плакаты з наступным зместам: «Долой тиранов! Да здравствует справедливость!», «Прекратите, паразиты издеваться!», «Преступники! Вас ждет расправа!»

Раніцай 21-га кастрычніка другая, трэцяя і чацвёртая групы IV курса не выйшлі на заняткі. Пасля абеду не выйшлі на заняткі і навучэнцы першай групы. Спробы дырэктара і камітэта камсамола вярнуць навучэнцаў на заняткі былі безвыніковымі. Толькі пасля таго, як Шавярэнка быў дапушчаны да ўрокаў, усе навучэнцы пасля абеду 22 кастрычніка выйшлі на заняткі [4, арк. 9–10].

Праверка, накіраваная ў тэхнікум абкамам ЛКСМБ, прыйшла да высновы, што дадзеная з'ява стала вынікам запушчанай выхаваўчай работы, памяншэння ролі камсамольскай арганізацыі ў жыцці і вучобе навучэнцаў, а таксама педагагічных памылак з боку выкладчыцкага калектыву і дырэктара тэхнікума (так, адзначалася, што шматлікія з выкладчыкаў былі спецыялістамі ў сваёй справе, але не мелі педагагічнай адукацыі і вопыту работы).

Сакратар Гродзенскага абкама ЛКСМБ Г. Фомічаў адзначаў, што ў тэхнікуме не заўсёды ствaралася грамадскае меркаванне супраць парушэння дысцыпліны і фактаў няправільных паводзін. Дырэкцыя адміністрацыйным шляхам вырашала ўсе пытанні, якія былі звязаныя з няправільнымі паводзінамі асобных навучэнцаў. А камітэт камсамола тэхнікума, пасля накладання адміністрацыйных спагнанняў дырэкцыяй, паўторна абмяркоўваў гэтыя факты і караў другі раз навучэнцаў. Такім чынам адсутнічала выхаваўчая роля калектыву, як самая вялікая сіла грамадскага ўздзеяння і асуджэння правіннасці членаў гэтага калектыву, а адміністрацыйнае ўздзеянне выклікала няправільную рэакцыю і незадаволенасць сярод некаторых навучэнцаў.

Факт таго, што навучэнцы не выйшлі на заняткі, быў абмеркаваны на пасяджэнні камітэта камсамола. Во ўсіх групах тэхнікума былі праведзеныя камсамольскія сходы, на якіх выступілі 150 камсамольцаў. Пасля быў праведзены агульны камсамольскі сход навучэнцаў тэхнікума. У ліку тых, хто на ім выступаў, былі сем камсамольцаў, што не выйшлі на заняткі. Яны прызналі, што паддаліся на правакацыю і своечасова не разабраліся ў сутнасці свайго ўчынку [4, арк. 10].

Прадстаўнікі камітэта камсамола тэхнікума атрымалі пакаранні (пазбаўленне пасады і строгая вымова з занясеннем ва ўліковую картку). Дырэктару тэхнікума на пасяджэнні бюро Слонімскага райкама КПБ была абвешчана строгая вымова з занясеннем ва ўліковую картку, аналагічнае пакарэнне атрымаў намеснік дырэктара. 12 лістапада 1954 г. адбылося пасяджэнне абкама КПБ, на якім разглядалася пытанне аб рабоце тэхнікума [4, арк. 11].

Аналізуючы дзейнасць і прычыны ўзнікнення нонканфармісцкіх суполак у тэхнікумах і вучылішчах БССР у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе, можна вылучыць некалькі ўмоўных напрамкаў дзейнасці і прычын узнікнення. Гэта суполкі, якія займаліся дзейнасцю, якая была прызнаная ў той час антысавецкай (групы, якія ўзніклі ў 1946 г. Пастаўскім і Глыбоцкім педвучылішчах); групы якія ўзнікалі як таемныя арганізацыі, без акрэсленай палітычнай мэты (група «анархісты», якая ўзнікла ў Беларускім электратэхнікуме сувязі, г. Пінск), а таксама праяўленне рэакцыі моладзі на дзеянні адміністрацыі навучальных устаноў (Жыровіцкі тэхнікум механізацыі сельскай гаспадаркі). Адзначым, што архіўныя крыніцы паказваюць, што названыя нонканфармісцкія суполкі ўзнікалі пераважна на тэрыторыі заходніх абласцей БССР.

Вывучэнне дзейнасці такіх арганізацый спрыяе сістэматызацыі ведаў пра сацыяльныя і палітычныя ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе, а таксама адлюстроўвае паўсядзённасць у дадзены перыяд.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Валаханович И. А.* Антисоветское подполье на территории Беларуси в 1944–1953 гг. Минск: БГУ, 2002.
2. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф. 63п. Воп. 15. Спр. 30.
3. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 31. Спр. 4.
4. НАРБ. Ф. 63п. Воп. 31. Спр. 10.